Культуролаг Юлія ЧАРНЯЎСКАЯ:

# «ЭТНАС МОЖА ЖЫЦЬ У ПЯЧОРЫ, НАЦЫЯ — НІКОЛІ»

**ЮЛІЯ Чарняўская. Яе дзядуля пісаў для дзяцей і доўгі час узначальваў «Вясёлку». Яе муж стварыў беларускі інфармацыйны партал tut.by. Дачка заканчвае факультэт філасофіі і сацыяльных навук БДУ. Маці, жонка і ўнучка. Тры якасці. Тры гісторыі. Але ёсць яшчэ. Юлія Чарняўская як культуролаг і пісьменнік. Пра іх і пагаворым.**

***— У сваёй апошняй кнізе «Беларусы: ад «тутэйшых» да нацыі» вы карыстаецеся цікавай формай аповеду: дасавецкі час перадаецца праз казкі, савецкі — праз ліставанне, наш час адлюстроўваецца праз блогі. Як прыйшла ідэя такога ўвасаблення тэмы?***

— У многіх краінах даўно існуе такі навуковы кірунак, як даследаванне штодзённасці. Ён бярэ пачатак ад французскай «Школы Аналаў», або школы ментальнасці. У Беларусі такіх даследчыкаў мала, і часам яны нават не ведаюць адзін пра аднаго. А ва ўсім свеце накірунак вельмі развіты. Даследаванне штодзённасці: як жылі, як любілі, што елі, што лічылі нормай. Гэтыя ўстаноўкі ўзнікаюць міжволі, мы не звяртаем на іх увагі, мы іх не ведаем, пакуль не сустрэнемся з іншымі нацыямі і не супаставім лад жыцця. Штодзённасць становіцца відавочнай у тэкстах культуры. Ні ў чым больш. Прычым у тэкстах «інтымных», тэкстах, прызначаных для сябе і для блізкіх.

Я спачатку займалася фальклорам — сацыяльна-бытавымі казкамі. У мяне нават кніга па казках выйшла. Гадоў пяць я чытала казкі і рабіла на іх карткі, а пасля за тры месяцы напісала кнігу. Мне хацелася як найхутчэй распавесці пра людзей, якіх я там — у гэтых казках — сустрэла.

Пасля быў аналіз прыватнай перапіскі. Руская даследчыца Наталля Казлова ў кнізе «Савецкія людзі» спрабавала зразумець, хто такі савецкі чалавек — ахвяра ці пераможца, кім ён быў і як жыў. Аб'ектыўна, без т. зв. «стыгмы». Яе кніга мяне вельмі ўразіла. Менавіта там я ўпершыню даведалася пра методыку чытання чалавечых дакументаў.

Што гэта такое? Лісты, дзённікі, жыроўкі, квітанцыі, паштоўкі... Дакументы штодзённасці. У Казловай, напрыклад, эпоха адлюстраваная праз дзённік жанчыны з трыма класамі адукацыі. Той жа шлях «чытання чалавечых дакументаў» абрала і я, аналізуючы лісты, а пасля і блогі. Пытанняў і не ўзнікала, што браць — блогі ці форумы. На форумах жыве прынцып «давай па мордзе дам», у блогах людзі аргументуюць свае думкі.

***— У Беларусі прынята лічыць, што нацыя — гэта народнасць са сваёй тэрыторыяй, сімволікай і самасвядомасцю, галоўным з крытэрыяў якой ёсць мова. Як лічыце вы?***

— Гэты тэзіс узнік у XIX ст. — збольшага тады гэта было праўдай. XX стагоддзе ўсё змяніла. Мяне заўсёды раздражняла, калі ў пачатку 90-х казалі, што ў беларусаў няма самасвядомасці. Думка грунтавалася на тым, што людзі размаўляюць па-руску. Я ў гэта не верыла. Хоць бы таму, што часта сама размаўляла па-руску, але заўсёды лічыла сябе беларускай. У XX ст. двухмоўных і трохмоўных нацый не менш, чым аднамоўных. Тым не менш людзі ў гэтых краінах успрымаюць сябе як адзіную нацыю. Узяць хоць бы швейцарцаў. У іх чатыры мовы, але паспрабуй сказаць, што яны не нацыя?! Мова — гэта важная рэч, але падчас станаўлення нацыі. Важная, але не адзіная.

Наогул монаэтнічных нацый сёння практычна не існуе. Іх ёсць сем ці дзесяць — ісландцы, палякі, ізраільцяне, армяне і інш. У большасці ж нацыі поліэтнічныя. Іншае пытанне, на якой мове яны размаўляюць. Людзі павінны абавязкова валодаць дзяржаўнымі мовамі. На якой размаўляць — іх правы, а ведаць павінны абедзве. Калі да цябе звяртаюцца па-беларуску, адказаць ты павінен па-беларуску, калі па-руску, то і адказвай па-руску — гэта правілы прыстойнасці.

Наша самасвядомасць была б няпоўнай, калі б мы не адчувалі сябе грамадзянамі незалежнай краіны. Этнас можа жыць у пячоры, нацыя — толькі як сацыяльна-палітычная грамадзянская супольнасць. І калі я чытала блогі, я ўбачыла, што людзі сябе такім грамадствам усведамляюць. Каля 20 працэнтаў насельніцтва ў нас не этнічныя беларусы, але яны — грамадзяне Беларусі і, выязджаючы за мяжу, называюць сябе беларусамі. Мы — поліэтнічная білінгвістычная нацыя. Як і многія іншыя ў Еўропе.

***— «Тутэйшасць» звычайна ўспрымаецца як з'ява, якая замінае развіццю. На вашу думку, ці ёсць у «тутэйшасці» дадатныя бакі?***

— Тутэйшасць уласцівая не толькі беларусам. У тых жа эстонцаў былі свае тутэйшыя, ды і ў каго іх не было? У Расіі да XX стагоддзя сяляне збольшага таксама былі тутэйшымі. Але так можа жыць этнас, а нацыя звязаная ў першую чаргу з гарадской цывілізацыяй. Нацыя звязаная з эканомікай, палітыкай і г.д., а этнічная тутэйшасць — з аграрнай цывілізацыяй. Таму тутэйшасць у сэнсе «давайце жыць сваім маленькім герметычным колам, мы ўсіх тут ведаем» якраз і перашкаджае развіццю нацыі і культуры. З часоў тутэйшасці ёсць у беларусаў адна вельмі добрая рыса — інтэлігентнасць. Гэта значыць — «не грузіць» сабой субяседніка. Але ёсць тут і іншы бок: «Я ціхі і памяркоўны, і ты будзь ціхім і памяркоўным. Не выстаўляйся, не лезь» — гэта мы ўвабралі з малаком маці. У сваёй кнізе я апісвала якраз такога чалавека, які кожны дзень ходзіць з намі па вуліцах, стаіць у чарзе і ціснецца ў тралейбусе. Бо хто пра яго напіша? Вось я і напішу. Пры ўсіх добрых якасцях гэты чалавек не любіць, калі хтосьці побач выстаўляе сябе і пазіцыянуе вельмі ярка.

### Валянцін Акудовіч — адбітак Сымона Буднага

***— Ваша стаўленне да новых беларусаў?***

— А хто гэта? Новыя «беларускія рускія»? (*смяецца* — **Аўт.**). Як бы іх няшмат, і я з імі ніяк не стасуюся. А вось тое пераможнае царства гламуру, якое прыйшло ў беларускую культуру, гэта страшна. Убога, бяздарна і вельмі брыдка. Але ў маім свеце гэтага няма. У маім свеце ёсць універсітэт культуры, і мае суразмоўцы — напрыклад, пісьменнікі і навукоўцы. Мама, дачка, муж і сябры. Сабака. А цяпер і вясна. У маім свеце існуе проза, якую я пішу, і навука, якой займаюся. Усё астатняе за кадрам.

***— У які перыяд станаўлення беларускай нацыі вы хацелі б жыць?***

— Як цікава: нядаўна, калі мы з маімі гасцямі на TV.tut.by (там я вяду перадачу «Без адказаў») размаўлялі пра Савецкі Саюз, нам задалі якраз такое ж пытанне. Мы хорам працытавалі Аляксандра Кушнера: «Времена не выбирают, в них живут и умирают(...) Время — это испытанье, не завидуй никому». Я б хацела жыць у свой час.

***— У сучасных фільмах героі розных эпох падарожнічаюць у вымярэннях і перамяшчаюцца ў розныя стагоддзі. Калі пераважаць і перанесці якіх-небудзь дзеячаў Беларусі мінулых стагоддзяў у наш свет і наадварот, каго б вы выбралі?***

— Ведаеце, ёсць літаральныя адбіткі людзей. Валянцін Акудовіч, на мой погляд, гэта такі адбітак Сымона Буднага. Будны — адна з самых для мяне знакавых фігур у беларускай гісторыі. З Акудовічам я незнаёмая, але ён выклікае ў мяне цікавасць і павагу — за цвёрдую і глыбокую жыццёвую і творчую пазіцыю. І за талент. Верагодна, і Сымон Будны паводзіў бы сябе ў нашым часе, як Валянцін Акудовіч. Што датычыць дзяржаўных дзеячаў, то, думаю, наўрад ці хтосьці з сучаснай Беларусі адчуў бы сябе ўтульна ў іншым вымярэнні — кожны з іх ствараў свой час.

Яшчэ б я перанесла сюды Купалу, Багдановіча і Караткевіча. Інтэлігенцыя вышэйшага пілатажу заўсёды вельмі запатрабаваная. А гэтыя празвішчы для беларусаў — сімвалы, легенды. Сёння, калі з'яўляюцца таленавітыя паэты і празаікі, яны мала каму патрэбныя як пісьменнікі. Ад іх чакаюць нечага яшчэ. Відаць, той місіі, якая б зрабіла з пісьменніка легенду. На вялікі жаль, часам здаецца, што ўсё меншая колькасць людзей гэтага чакае. І так не толькі ў нас — увесь свет ідзе ад працэсуператварэння інтэлігенцыі ў інтэлектуалаў, а інтэлектуалаў — у «белыя каўнерыкі»...

***— У сувязі з гэтым дадатковае пытанне — з кім з выбітных асобаў (акрамя Сымона Буднага) вы хацелі б пазнаёміцца?***

— Шмат з кім. Я люблю Скарыну. З яго, па вялікім рахунку, і пачалася беларуская інтэлігенцыя. Сустрэлася б і з Агінскім — цікава даведацца, што ім рухала, калі ён спрабаваў дамовіцца з царом Аляксандрам аб аднаўленні Рэчы Паспалітай у межах Расійскай імперыі. Але найбольш даспадобы мне фігуры рубяжа XIX—XX стст. — Луцкевіч, напрыклад. Увогуле я прыхільнік такой устаноўкі, якая іх усіх аб'ядноўвае: мне падабаюцца людзі, якія думаюць пра штосьці і пра кагосьці яшчэ, апроч сябе.



Фота Ягора ВОЙНАВА.

### ТОП-9 ДЛЯ ЮЛІІ ЧАРНЯЎСКАЙ:

**1. Любімае беларускае слова?**

**— Дзядуля...**

**2. Любімая кніга?**

**— Ёсць шмат кніг лепшых, але самая мая, па-чалавечы любімая — «Забіць перасмешніка» Харпер Лі . З шасці гадоў і да сёння.**

**3. Любімае месца ў Мінску і ў Беларусі?**

**— Аляксандраўскі сквер і вуліца К. Маркса, бо там прайшло маё дзяцінства. У Беларусі вельмі люблю Браслаўскія азёры.**

**4. Дадатная і адмоўная якасць беларуса?**

**— Унутраная інтэлігентнасць і самаіронія — дадатныя. Адмоўная — боязь перамен.**

**5. Любімы блог?**

**— Іх некалькі: «diim-august», «hareuski», «vadzim i_z»,,,**

**6. Прыклад інтэлігентнасці для вас?**

**— У рускай культуры — Юры Лотман і Ліліяна Лунгіна, у беларускай культуры — Радзім Гарэцкі, Гурый Барышаў, сучасны паэт Канстанцін Міхееў. А ўвогуле, мой вобраз ідэальнага інтэлігента для мяне — мой дзед...**

**7. Любімае беларускае імя?**

**— Алесь і Данута. А маю дачку завуць любімым рускім — Яўгенія.**

**8. Якую кнігу ў 3D-фармаце хацелі б паглядзець?**

**— Аўтар адзін — Жазэ Сарамага. А вось кнігі дзве — «Евангелле ад Ісуса» і «Перабоі ў смерці». Слаба веру, што іх можна экранізаваць. Але калі надарыцца, відовішча будзе велічнае.**

**9. Калі б не культуралогія, то якая сфера дзейнасці?**

**— Я хацела стаць урачом, як мае бацькі. Другі варыянт — шматдзетнай маці. Трэці варыянт — няспраўджаны, пра яго змаўчу.**

### Гісторыя — пытанне выбару версій

— Калі я прачытала беларускія казкі, то зразумела адну цікавую рэч: беларус па натуры метафізік. Гэта было дзіўна, бо да гэтага я жыла ў коле стэрэатыпаў: беларус — прагматычны, зямны, далёкі ад высокіх матэрый. А тут убачыла: кожны крок беларускага селяніна звязаны з пэўнымі філасофскімі разважаннямі. Яны як падмурак яго штодзённасці, таго самага прагматызму. Для мяне гэта было адкрыццём.

Што яшчэ? Ёсць этнасы славесныя, а ёсць больш візуальныя. Мы — больш візуальная нацыя. Паглядзіце, як цікава рэалізуюцца беларусы ў жывапісе і дэкаратыўным мастацтве. Адзінай загадкай у сувязі з гэтым для мяне застаецца развіццё кінематографа ў сучаснай Беларусі...

***— У адным з інтэрв'ю вы ўзгадалі пра ідэю беларускага нацыянальнага міфа...***

— Без міфаў увогуле нічога няма, любая гісторыя ў значнай ступені міф. Некаторыя з сучасных французаў шчыра перакананыя, што ў вайне 1812 года перамог Напалеон. Гісторыя — гэта пытанне выбару версій. Поўнасцю вярнуць рэальнасць немагчыма, таму мы заўсёды гуляем з міфам. У сваёй кнізе я пералічыла сем варыянтаў беларускай гісторыі... Ёсць там і пра ліцвінаў, і пра беларусаў, і пра крывічоў, і пра так званых «саўкоў»...

***— Самае вялікае ваша адкрыццё падчас напісання кнігі?***

— Яно прыйшло не ў час напісання кнігі. Гэта было ў пачатку 1990-х. Я ішла па вуліцы з сябрамі, якія збіраліся ў эміграцыю. Мы якраз абмяркоўвалі гэтае пытанне: на дварэ разруха, грошай няма і не будзе, кватэры няма і «не свеціць», а ў мяне маленькае дзіця... Гэта быў перадкаляды час, і якраз насупраць я ўбачыла калядоўшчыкаў: былі там і зорка, і каза, і мядзведзь, і цыганка, у якую быў пераапрануты юнак... Усё гэта было новым для нас, мы прывыклі яшчэ лічыць сябе савецкімі людзьмі. Была там баба, быў мужык. І я ўбачыла на гэтым «мужыку» строй — ільняную кашулю з акуратненькімі латкамі. І так яны разанулі па сэрцу... Я падумала: нікуды я адсюль не паеду.

Гутарыў Ілья ЛАПАТО.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУ